Аўтар: Рэдакцыя
13.05.2018 00:00

“Ружанец
на ўзбярэжжы”

Гэтая малітоўная акцыя грунтавалася на польскім “Ружанцы да межаў”. У ёй прынялі ўдзел некалькі дзесяткаў тысяч католікаў Вялікабрытаніі.

Ініцыятарамі выступілі свецкія людзі. Але акцыя атрымала падтрымку біскупаў і нават самога папы Францішка, які ўпэўніў удзельнікаў малітвы ў сваёй духоўнай падтрымцы. Ружанец адгаворвалі ў больш за 400-ах розных месцах. Тыя, хто не мог дабрацца на ўзбярэжжа, маліліся на берагах рэк ці каналаў, а таксама на мастах. Людзі прасілі аб адраджэнні веры і аб культуры жыцця. Асаблівым кантэкстам малітвы была таксама трагедыя Альфі Эванса (двухгадовага хлопчыка, якога па рашэнні суда адключылі ад апаратаў жыццязабеспячэння).

†

Ларэтанская літанія
ў Беларусі дапоўнена
новым заклікам

Рашэнне дадаць у тэкст літаніі на беларускай мове заклік “Каралева Беларусі, маліся за нас” было прынята на пасяджэнні Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі. Рашэнне епіскапату з’яўляецца выражэннем набожнасці мясцовых вернікаў. У першую чаргу, гэта датычыць ушанавання абраза Маці Божай Бялыніцкай, каранаванага папскімі каронамі 20 верасня 1761 года.

Тэкст Ларэтанскай літаніі на лацінскай мове з’яўляцца ўзорным пры перакладзе на іншыя мовы. Аднак некаторыя супольнасці атрымліваюць дазвол на тое, каб дадаваць да яго дадатковыя заклікі, якія часам становяцца агульнапрынятымі ва ўсім Касцёле. Такім чынам, з адабрэння Ватыкана з мая бягучага года вернікі Беларусі дадаюць у літаніі новы зварот да Маці Божай пасля закліку “Каралева супакою”.

Аўтар: Рэдакцыя
13.05.2018 00:00

